**Г. Унуковіч**

# ПРАБЛЕМА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ НА СТАРОНКАХ «НАШАЙ НІВЫ»

Узнікненне «Нашай Нівы» паклала пачатак новаму перыяду ў гісторыі Беларусі, багатаму па сваім нацыянальным змесце і па сваёй плённасці, а газета была галоўнай спружынай, якая рухала яго развіццё і з'яўлялася духоўным асяродкам, розумам і сэрцам. Асаблівую ўвагу «Наша Ніва» надавала стварэнню беларускай сістэмы адукацыі. Ужо з першага нумару газета адрознівалася сваім палымяным словам. Яна пачынае барацьбу за права беларусаў гаварыць і вучыцца на роднай мове. Прапановы аб стварэнні нацыянальнай школы падтрымліваў і просты люд, аб чым сведчылі лісты ў рэдакцыю «НН» з месцаў.

У рэалізацыі пастаўленай мэты рэдакцыя газеты сутыкнулася з наступнымі цяжкасцямі:

1) ідэалагічныя перашкоды цэнзуры, што чынілі ўлады;

2) фінансавыя праблемы. Праз эканамічную слабасць беларускай нацыянальнай буржуазіі рэдакцыя не магла разгарнуць на поўную моц сваю асветніцкую дзейнасць. Яе падтрымлівалі – «паркалёвая інтэлігенцыя» і сялянства, якія проста не мелі грошаў;

3) раз'яднанасць беларускага насельніцтва па веравызнанні на праваслаўных і католікаў, пры гэтым да тых і да другіх даводзілі, што іх «мужыцкая мова» – дыялект, і што яна не мае права на існаванне.

Тым не менш, рэдакцыя газеты зрабіла ўсё магчымае, каб рэалізаваць пастаўленыя задачы. Ва ўмовах палітычнай рэакцыі яна не магла адкрыта выступаць супраць вялікадзяржаўнай палітыкі царызму ў Беларусі і засяродзіла сваю ўвагу на паслядоўным ажыццяўленні культурна-асветніцкай дзейнасці. Ідэя аб заснаванні беларускіх школ, выказаная газетай, атрымала падтрымку сярод пэўнай часткі беларускага грамадства, і такія паўлегальныя прыватныя і нядзельныя школы, вучылішчы, семінарыі адкрываюцца ў розных кутках Беларусі, сведчаннем чаго зяўляюцца матэрыялы публікацый у газеце.

Такім чынам, праз намаганні выдаўцоў «НН» узнікаюць першыя беларускія школы для дзяцей беларусаў, а разам з імі патрэба ў вучэбных дапаможніках для яе. Тут можна ўзгадаць *«Першае чытанне для дзетак беларусаў» (А. Пашкевіч, 1906)*, пасля *«Другое...» пад пяром Якуба Коласа (1910, выдавецтва «Наша Хата»)*. Таксама ўстановы адукацыі мелі вострую патрэбу ў падручніках па гісторыі, якія б былі даступныя і зразумелыя дзецям, і не толькі ім, бо ў пачатку XX ст. наогул не існавала ніводнай напісанай з нацыянальна беларускіх пазіцый абагульняючай працы па гісторыі Беларусі. Такой працай стала «Кароткая гісторыя Беларусі» В. Ластоўскага, якую ў 1910 г. пачала друкаваць на сваіх старонках «Наша Ніва». Нягледзячы на намаганні адміністрацыі не дапусціць стварэння вучэбных дапаможнікаў, школы адкрываліся і існавалі за кошт сродкаў прыватных асоб з ліку свядомай беларускай інтэлігенцыі. Такім чынам, «Наша Ніва» адыграла выключную ролю ў стнаўленні народнай адукацыі на пачатку XX стагоддзя.